УДК 631.158 : 658.310.16

Е. Р. ВІТУН

УДАСКАНАЛЕННЕ МЕТОДЫКІ ПАДЛІКУ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ ПРАЦЫ

У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца галоўным чынам паказчык прадукцыйнасці працы, разлічаны на базе валавой прадукцыі і колькасці сярэднегадавых працуючых (або ліку адпрацаваных чалавека-гадзін). Ужыванне названага паказчыка прыводзіць да паўторнага ўліку нетаварнай прадукцыі, якая паступае ва ўнутрыгаспадарчы абарот, што нярэдка істотна скажае параўнальную ацэнку ўплыву асобных фактараў. Таму шмат у якіх выпадках перавагі заслугоўвае паказчык прадукцыйнасці працы, лічнікам якога з'яўляецца канчатковая або чыстая прадукцыя.

Выступаючы на сходзе актыву Ленінградскай партыйнай арганізацыі, Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў сказаў: «...Трэба пераходзіць у асноўным да таго, каб лічыць прадукцыйнасць на аснове нацыянальнага даходу. А нацыянальны даход тым большы, чым менш затрат не толькі жывой, але і арэчаўленай працы на адзінку прадукцыі. Так яшчэ Маркс ставіў гэтае пытанне, так ставіў яго і Ленін»[1].

Нацыянальны даход — гэта навукова абгрунтаваны вымяральнік аб'ёму вытворчасці, які трэба выкарыстоўваць як асноўны паказчык для вымярэння прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы — асноўным звяне аграпрамысловага комплексу. Нацыянальны даход (чыстая прадукцыя) — крыніца спажывання (асабістага і грамадскага) і назапашвання. Рацыянальныя суадносіны паміж спажываннем і назапашваннем дазваляюць пры задавальненні неабходных патрэб членаў грамадства забяспечыць хуткімі тэмпамі пашыранае ўзнаўленне.

Пакажам на прыкладзе калгасаў Гродзенскай вобласці, як змянялася прадукцыйнасць працы за апошнія 17 гадоў пры розных метадах яе вымярэння (табл. 1). Як відаць з табліцы, у сярэднім за 1986—1988 гг. у параўнанні з 1971—1975 гг. прадукцыйнасць працы ў калгасах, вызначаная па аб'ёме валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў разліку на аднаго сярэднегадавога працуючага, павысілася ў 4,7 раза, па валавым даходзе ў разліку на аднаго працуючага — у 3,9 раза.

Пры разліку прадукцыйнасці працы па валавым даходзе павінна захоўвацца чысціня методыкі разліку. Валавы даход як чыстая прадукцыя павінен быць пазбаўлены розных надбавак да цэнаў за нізкую рэнтабельнасць або стратнасць. Ва ўмовах Гродзенскай вобласці, напрыклад, на велічыню валавога даходу істотны ўплыў робяць надбаўкі. Так, за перыяд дзеяння надбавак у 1983—1988 гг. іх доля ў валавым даходзе калгасаў ад жывёлагадоўлі склала 25—30, а па малацэ — 35—40%.

Разлікі прадукцыйнасці працы па валавым даходзе, адкарэкціраваным на велічыню надбавак, паказалі, што ў жывёлагадоўлі калгасаў вобласці за 1976—1988 гг. яна знізілася на 19,8%. Сярэднегадавы тэмп зніжэння прадукцыйнасці працы склаў 2,1%. Разлікі паказваюць, што без уліку надбавак сярэднія каэфіцыенты прадукцыйнасці працы за 1976—1988 гг. у малочнай жывёлагадоўлі калгасаў вобласці штогод знізіліся на працуючага на 1,8 і на чалавека-гадзіну — на 1,5%. З улікам надбавак прадукцыйнасць узрастала штогод у сярэднім на 10 і 15%.

Важнасць вызначэння прадукцыйнасці працы па валавым даходзе ўзрастае ў сучасны момант у сувязі з пераходам да аплаты працы ад валавога даходу, што з'яўляецца важнейшым каналам супрацьзатратнага механізму.

Разам з тым далейшае паляпшэнне вымярэння прадукцыйнасці працы павінна быць забяспечана не толькі шляхам пошуку новых паказ-

[1] Горбачев М. С. Избр. речи и статьи. Т. 2. М., 1987. С. 218.

Табліца 1. **Узровень прадукцыйнасці працы ў калгасах Гродзенскай вобласці**

Паказчык	Гады			
	1971—1975	1976—1980	1981—1985	1986—1988
Валавая прадукцыя ў разліку на аднаго працуючага (у супастаўных цэнах 1983 г.), руб.	2006	3266	4196	9450
Валавы даход у разліку на аднаго працуючага, руб.	1305	1891	3001	5145

чыкаў вытворчасці прадукцыі, але таксама пры дапамозе больш поўнага ўліку затрат жывой і арэчаўленай працы.

У рабочым часе ўлічваюцца толькі затраты жывой працы, а расход мінулай працы падлічваецца ў вартаснай форме. Таму для вызначэння сукупных затрат неабходны пералік матэрыяльных затрат, пададзеных у грашовым вылічэнні, у працоўнае вымярэнне па спецыяльнай методыцы. Асновай уліку затрат сукупнай працы ў сельскай гаспадарцы служыць вытворчая калькуляцыя сабекошту прадукцыі. Для сельскай гаспадаркі прапанаваны рад методык падліку сукупных затрат працы, якія ўлічваюць спецыфічнасць гэтай галіны. З усіх існуючых методык разліку сукупных затрат працы ў сельскай гаспадарцы ў якасці асноватворнай намі выбрана методыка прафесара Е. С. Карнавухавай. Гэтая методыка, з нашага пункту погляду, з'яўляецца найбольш дасканалай у тэарэтычных, а таксама простай і даступнай у практычных адносінах. Яе сутнасць заключаецца ў тым, што яна рэкамендуе выкарыстоўваць фактычныя даныя сабекошту прадукцыі мінулай прамысловай і сельскагаспадарчай працы з наступным пераводам іх у працоўнае вымярэнне.

У працэсе даследавання ў гэтую методыку былі ўнесены змяненні. Гэта звязана з наяўнасцю двайнога ўліку ўскосных затрат жывой працы. Згодна з дадзенай методыкай, яны адначасова ўлічваюцца ў складзе затрат жывой і мінулай прамысловай працы (ускосныя затраты жывой працы ўваходзяць у склад комплексных артыкулаў затрат на ГЗМ, аўтатранспарт, бягучы рамонт асноўных сродкаў — у выглядзе аплаты працы, якія ў працэсе разлікаў не вылучаюць са складу гэтых артыкулаў, а адносяць да затрат мінулай прамысловай працы). У працэсе разлікаў у методыку былі ўнесены наступныя змяненні: з комплексных артыкулаў затрат (ГСМ, аўтатранспарт, бягучы рамонт асноўных сродкаў) вылучаны ўскосныя затраты жывой працы (па долі аплаты працы ў іх), скарэкціраваны разлікі па затратах працы ў артыкулах затрат на насенне, угнаенні і інш.

У састаў сукупнай працы ўключаюцца затраты жывой (прамыя і ўскосныя) і мінулай працы. У сувязі з гэтым у кожным артыкуле вытворчай калькуляцыі прадукцыі вылучаюцца ўскосныя затраты жывой працы (працы працуючых, звязаных з функцыямі кіравання і абслугоўвання вытворчасці), затраты мінулай сельскагаспадарчай працы (насенне, кармы, арганічныя ўгнаенні), мінулай прамысловай працы (мінеральныя ўгнаенні, ГЗМ, купленыя насенне і кармы, машыны, абсталяванне і г. д.). Пры гэтым разлік сукупных затрат працы ажыццяўляюць у наступным парадку: затраты жывой працы вызначаюцца паводле даных гадавых справаздач гаспадарак; пасля вылучэння расходу жывой працы з комплексных артыкулаў вылучаюць затраты мінулай сельскагаспадарчай і прамысловай працы ў вартаснай форме па артыкулах затрат; атрыманую велічыню затрат мінулай сельскагаспадарчай працы ў вартаснай форме ў затратах на насенне карэкціруюць на велічыню прамысловых затрат, якія тут маюць месца; разбіўка затрат на ўгнаенні па іх відах (мінеральныя і арганічныя), якая адпавядае затратам мінулай прамысловай і сельскагаспадарчай працы, робіцца на падставе прапорцый паводле даных гадавой справаздачы; на падставе праведзенай

Табліца 2. **Поўная працаёмістасць вытворчасці прадукцыі вучгаса «Прынёманскі» Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута, у сярэднім за год, чал.-гадз**

Паказчык	Зерне		Бульба	
	1981—1985 гг.	1986—1989 гг.	1981—1985 гг.	1986—1989 гг.
Сукупныя затраты працы на 1 ц прадукцыі:				
жывой працы, усяго	2,54	2,31	2,16	1,56
у тым ліку прамыя	1,26	1,21	1,17	0,92
ускосныя	1,28	1,10	0,99	0,64
мінулай працы, усяго	4,78	5,20	5,77	5,03
у тым ліку сельскагаспадарчай	1,26	1,88	3,14	2,49
прамысловай	3,52	3,32	2,63	2,54
Сукупныя затраты працы на 1 га пасеву:				
жывой працы, усяго	66	50	333	190
у тым ліку прамыя	32	27	179	112
ускосныя	34	23	154	78
мінулай працы, усяго	123	128	772	706
у тым ліку сельскагаспадарчай	32	46	384	381
прамысловай	91	82	388	325

расшыфроўкі класіфікуюць групы затрат мінулай сельскагаспадарчай і прамысловай працы ў вартаснай форме. Потым вызначаюць затраты мінулай сельскагаспадарчай і прамысловай працы ў працоўным вымярэнні.

На падставе атрыманых даных вызначаюць поўную працаёмістасць вытворчасці, якая разам з агульнай колькасцю працы, затрачанай на вытворчасць прадукцыі, дазваляе бачыць змяненні ў яе складзе. Сукупныя затраты працы на вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі вызначаны па распрацаванай методыцы і пададзены ў табл. 2. Як відаць, поўная працаёмістасць вытворчасці знізілася. Такім чынам, удасканаленне метадалагічных асноў вымярэння прадукцыйнасці працы дазваляе вызначыць і ўлічыць поўную велічыню затрат працы на яе вытворчасць і на падставе гэтага атрымаць найбольш дакладнае ўяўленне пра характар росту прадукцыйнасці працы і рэзервы яе эканомікі.

Прадукцыйнасць працы па метадзе валавой прадукцыі вызначаецца па формуле

$$П_в = \frac{C + v + m}{ч}. \qquad (1)$$

Важнейшы вартасны паказчык прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы — аб'ём валавой прадукцыі на аднаго сярэднегадавога працуючага. Аднак на сучасным этапе развіцця сельскай гаспадаркі ён не адказвае, на наш погляд, узрослым патрабаванням і не адпавядае задачы максімальнага павышэння эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. Пры існуючай методыцы падліку валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі мае месца паўторны ўлік спажытых сродкаў вытворчасці, што скажае ўзровень і дынаміку росту прадукцыйнасці працы, не стымулюе зніжэння матэрыялаёмістасці прадукцыі і павышэння яе якасці.

Так, атрыманы ў раслінаводстве корм для жывёлы другасна ўлічваецца пры яго спажыванні ў галінах жывёлагадоўлі. Паўторны ўлік адбываецца і ўнутры самой галіны жывёлагадоўлі. Выраблена тут прадукцыя, напрыклад малако, выкарыстоўваецца для гадавання маладняку і таму ўлічваецца двойчы, што ўплывае на велічыню аб'ёму валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі, выклікае скажэнне паказчыка сапраўднай прадукцыйнасці працы. Ва ўмовах паглыблення раздзялення працы паказчык вартасці валавога прадукта вядзе да завышэння вынікаў у сувязі з паўторным улікам выкарыстаных прамежкавых прадуктаў і паслуг. Такім чынам, гэты паказчык у сапраўднасці адлюстроўвае аб'ём вала-

вога абароту, суму вартасці як канчатковага, так і выкарыстанага прамежкавага прадукту. У сучасны момант у сувязі са стварэннем міжгаспадарчых прадпрыемстваў і аграпрамысловых аб'яднанняў маштабы ўнутрывытворчага абароту пашыраюцца, узрастае абмен вынікамі гаспадарчай дзейнасці. Усё гэта ўскладняе падлік вартаснага паказчыка валавога прадукту, які да таго ж не можа дакладна адлюстроўваць колькасць і дынаміку эфектыўнасці гаспадарання. Каб гэтага не адбывалася, пры разліку паказчыкаў прадукцыйнасці працы трэба на ўсіх узроўнях вытворчасці браць у разлік канчатковую прадукцыю, якую вызначаюць, выключаючы з валавой вартасць спажытай у вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

Па метадзе чыстай прадукцыі прадукцыйнасць працы вызначаецца па формуле

$$П_ч = \frac{v + m}{ч}. \qquad (2)$$

Гэты паказчык (ч — колькасць працуючых, чалавек) адлюстроўвае колькасць сельскагаспадарчай прадукцыі, якая будзе выкарыстана па-за галіной (для спажывання насельніцтвам краіны, прамысловасцю і г. д.). Па сутнасці, канчатковая прадукцыя выражае валавую прадукцыю, што вырабляецца ў сельскай гаспадарцы, без паўторнага ўліку. Падлік прадукцыйнасці працы па валавой прадукцыі прыводзіць да завышэння гэтага паказчыка, які ўзрастае ў сувязі з паглыбленнем спецыялізацыі і канцэнтрацыі і аграпрамысловай інтэграцыі.

Па метадзе поўных затрат прадукцыйнасць працы падлічваецца па формуле

$$П_з = \frac{C + v + m}{C + v}, \qquad (3)$$

дзе C — аб'ём (кошт) арэчаўленай, v — жывой працы, выкарыстаных для вытворчасці прадукцыі (у рублях), m — прыбытак (у рублях).

Усебаковы падлік поўных затрат працы на вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі і іх структуры дазволіць больш абгрунтавана і глыбока вызначаць узровень эфектыўнасці грамадскай працы і крыніцы яе эканоміі ў земляробстве і жывёлагадоўлі; падлічваць эфектыўнасць вытворчасці і новай тэхнікі; ускрыць наяўныя рэзервы і разлічыць аптымальную сукупную працаёмістасць кожнага віду сельскагаспадарчай прадукцыі па рэгіёнах. На гэтай падставе магчыма вырашаць шмат якія эканамічныя праблемы (навукова абгрунтаванае размяшчэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі на тэрыторыі краіны, пабудова занальных цэн і інш.).

Першапачатковы разгляд формул (1)—(3) адразу паказвае недахопы або годнасць метадаў. Пры росце (C+v) прадукцыйнасць працы, вылічаная метадам валавой або чыстай прадукцыі, расце. Пры тым жа росце (C+v) або C і v паасобна для метаду поўных затрат, згодна з формулай (3), гэта абазначае падзенне прадукцыйнасці працы. Такое сцвярджэнне можна даказаць, калі запісаць формулу (3) у выглядзе

$$П_з = 1 + \frac{m}{C + v}. \qquad (4)$$

З формулы (4), у прыватнасці, вынікаюць вывады: 1) на кожны рубель рэсурсаў прадпрыемства павінна атрымаць больш за рубель прадукцыі; 2) прадпрыемства, калі затраціла больш рэсурсаў, чым яму планавалася, павінна больш выпусціць прадукцыі ў натуральным выражэнні, г. зн. павялічыць прыбытак прапарцыянальна павелічэнню рэсурсных затрат.

Для далейшага выяўлення ўзаемасувязей разгледжаных вартасных паказчыкаў прадукцыйнасці працы відазменім формулы (1) і (2) такім